Цана асобнага нумэру 5 кап. (10 грошэй).

№ 1.

Вильня, 1 сенцября 1906 г.

Год I.

Наша Доля

першая белоруская газэта для вёсковаго и местоваго рабочаго народу.

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литерами.

Адрэс рэдакции и администрации: ***Вильна, Виленская вулица 32***

Цана: з перасылкаю и дастаукаю да хаты: на 1 год—**3 руб.**, на 6 месяцоу—**1 руб. 50 кап.**, на 3 мес.—**75 кап.**, на 1 мес.—**25 кап.** Без дастауки и перасылки: на 1 год — **2 р. 40 к.**, на 6 мес.—**1 р. 20 к.**, на 3 мэс.—**60 кап.**, на 1 мес. — **20 кап.** За границою: на 1 год—**4 руб.**, на 6 мес.—**2 р.**, на 3 мес.—**1 руб.** Перамена адрэсу—**20 кап.**

АБЪЯУЛЕННЯ прыймаюцця на наследняй страницы па **20 кап.** за линейку пэтиту.

Рукаписы и карэспандэнции, присыланыя у Рэдакцию, мусяць быць чытэльна написаны з фамильею и адрэсомъ таго, хто яе присылае. Адрэсъ тольки для ведама Рэдакции.

Наш палетак.

Наш палетак памиж межау,
З-за каторых цвяце збожа;
А наш скравак штось залежау;
Наш загон зысци ня можэ.
Ци то глеба да ничога?
Ци то руки у нас слабые,
Што ня маем й зерня свога,
Што мы ходзим як сляпые?
Глеба чорна, у руках сила,
Тольки нашых гаратаяу
Некасць мара усё звадзила
Гэн замежы да выраяу.
Наш сявец не раз там кидау
Залатое зерне з жмени,
Ён не раз там плёны выдау.
А у нас расли камени.
Наш палетак негараны,
Палынами цвяце нива.
Нука, братцы, кумы, сваты,
Да работы станьма жыва!
Хто гараци добра зможэ,
Хто разоры скоро ладзиць,
Хто шчасливе сее збожа,
Хто гароды добра садзиць
Жыво, жыво за работу
Без аглядки хто што можэ.
Усе роуны без расчоту
Усих праца будзе згожа!

Мацей Крапиука.

Да чытацелёу.

Прачхнууся з цяжукаго сну народ, падняуся як рэка на вясну за вяликае дзело свабоды и лепшае доли. Тольки з пад стрэхи цёмное хаты мужыка беларуса як дауней, як сотни гадоу таму назад веець холадом магильнаго сну. Там нядоля, цямнота и голад, яго прадауные вороги, звили сабе крэпкое гняздо, разраслися, распладзилися. Бывали таки и гэтакіе минуты у гисторыи апошних гадоу, што прасыпауся и беларус.

Галодны и ціомны будзіуся ён з цяжкаго сну и дзивавауся, и слухау як з далёкаго свету з усих старон ляцели да яго развалиушаеся хаты радосные весьци аб зямли, аб сва-

бодзи. И палюбиу йон гэту свабоду, як роднае дзицця свае, жыу йою, сниу аб йой у сваих думках и, смутным вокам наглядаючы у закрытае хмарами небо, з далёких старон прызывау яе у свой родны край.

Свабода не прыхадзила.

Але трудна было разстацца з думками аб счасци, и мужык настанавиу заваеваць гэту свабоду, што у пыл развеяць абецалася царство цямноты, и йшоу йон заваеваць сабе зямлю, што хлебом пшаничным абецалася накармиць яго. И гдзе тольки ступила нага яго— з дымам йшли панские палацы, свисцели нагайки и кули, лилася нявинная кроу, вырастали тысячы магилау...

А свабоды ня было, бо блудзиуйся мужык, збивауся з дароги, бо цёмныу быу йон, бо цёмна было кругом.

Усим, хто меу адвагу заглянуць у нашэ жыццio, сэрцы кроую сплывали гледзячы на усё гэта. И начали людзи шукаць прычыны нашае нядоли. Шукали у книжкох, пытали у самого жыцця. И усюды быу адзин адказ: „Дайце беларусу такую книжку, каб йон зразумеу, што у йой написана. Тольки книжка, написаная на мови бацькоу яго, патрапиць сноп свету закинуць у цяжкое жыццio беларуса, тольки яна патрапиць холад и голад выжануць з мужыцкае хаты, тольки яна пакажэць яму дарогу да лепшае яснейшае доли!“

Мы паслухали гэтаго голасу—выдаем „Нашу Долю“. Якая будзе яе праграма—згадаць лягко. Писаць яе мы будзем для вёски и будзем бараниць справы вiосковых людзёу. Личучы найбольшым нашым ворагом цямноту и бязпрауное палажэнне мужыка, мы объяуляем вайну усим цёмным силом, каторым дзеля карысци своёй вяликая выгода была трымаць восьмимильённы народ беларусски у ня доли и паневерцы, баламуциць и дурыць яго.

У дзисейшны вялики момэнт, кали усе народы государства Расейскаго, абъявиушы вайну старым парадком, напрагаюць усе свае силы, каб дабицца свабоды и лепшае доли, мы будзем разам з ими.

Цяжская и трудная выпала на «Нашу Долю» работа.

Мы верым, што шчырые прыяцели вяликае народнае справы памогуць нам у гэтай рабоци. Мы маем надзею, што пры их помочы «Наша Доля» разыдзецца далёка па усей нашэй мацци зямлицы Беларуской, пры их помочы у «Нашэй Доли» мы патрапим вывясци на свет Божы усе нашы справы, усе нашы думки, усю нашу долю-нядолю...

Мы верым у святосць народнае справы, мы верым у помоч нашых прыяцелёу!

Што будзе?

Што будзе далей?—вот пытанне, каторае як востры клин вбиваецца у голову кожнаго чэлавека, зганяець з вока сон, не дае спакою.— Што будзе далей?—так пытаюцца намещеки у сваих палацах, так пытаюцца мужыки у сваих курных хатах, так пытаецца уся працавита бедната и, з трывогай и надзеяю спаглядаючы у заутрашни дзень, чэкае таго вяликаго момэнту, кали сонцэ свабоды засвецыць и над нашым абездоленым краем.

Каб атказаць на гэта пытанне, трэба ближэй прыглядзецца на поступ выпадкоу апошняго часу.

Усим ведама, што для успакаення народу, каторы йшоу силаю дабываць зямлю и свабоду, правительство объявило, што яно хочэ нярамяниць старые парадки и дзеля таго скликае Гасударственую Думу. Народ паверыу правительству и паслау сваих выборных людзей, каб яны у Думи дабыли яму зямлю, свабоду и лепшую долю.

И чэкау народ гэтае доли, и веры, што яна прыйдзе...

Дума сабралася. Зъехалися у Пецербурх прасеяные праз дзесяць ситок народные дэпутаты. Увесь свет слухау, што скажуць яны. И яны загаварыли, загаварыли аб цяжкой нядоли, аб цямноци, аб безпраую... Земля и свабода патрэбны народу, гаварыли дэпутаты, бяз них нима счасьця народу, нима доли; бяз них адно цемнота и галодная смерць...

Правительство разагнало Думу. Яно гэтым ясна паказало, што не дасць народу ни зямли, ни праудзивае свабоды.

И народ зразумеу гэта. Зразумеу ён, што пасля разгону Думы засталося яму одно з двух: або так як дауней прападаць з голаду, або самаму памыслиць аб сваёй доли. И ён выступиу на бой за счасьце усей працавитай бедноты.

Збунтавалися матросы и салдаты у Кронштаци, у Рэвлю. Тры дни развевауся чырвоны штандар над сценами збунтованаго Сбэаборгу; бунтавалися салдаты и па других гарадох Расеи. Паднялись работники, паднялись па вёсках мужыки. Усюды льецца кроу. Ахфяры рэволюцыйнаго розруху падаюць з абодвых старон. Што дзень гинуць ад куль и бомб палицэйские, чыноуники, жандары, губэрнаторы. Праз адно тольки лета у гэтым гаду, як объявило правицельство, згинули таким парадком вось якие высшые чыноуники: камандзир чэрнаморскаго флоту адмирал Чухнин, што усмирау бунт матросоу у Сэвастополи; самарски губэрнатор—Блок; Варшауски генерал-губэрнатор Вонлярлярски; памочник варшаускаго генерал-губэрнатора да палицэйских спрау—генерал Маркграфски; камандзир лейб-гвардии семёноускаго палка-генерал Мин, што усмирау у дзекабры месяцы паустанне у Маскве. А скольки што дзень забиваюць гарадавых, стражникоу, жандароу и иншых палицэйских чыноуникоу—трудна и паличыць. Па усей Расеи што дзень бунтоущыки забираюць казённые грошы з казначэйств, почт, манаполек на вайну з правицельством.

Правицельство наводзило усюды военное палажэнне, надзвычайную и усиленую ахрану, але мала з таго было карысьцы. И вот цяпер правицельство зноу объяуляе, што за земельные бунты будзе без литосьцы разстрэливаць мужыкоу, что за убийства ды грабежы будзе судзиць военно-палевым судом, каторы карае або смерцью, або каторжными работами; яно павеличыло кару за намову салдатоу не стрэляць у народ,—и штож з таго? Ничого и гэта не памагае и не паможэ таму, бо цяпер бунтаущык—увесь стомильённы цёмны, галодны народ. Правицельство кроуюю залило цэлы край и думало гэтым успакоиць народ. Але штыками и кулями можна прыдушыць народ, можна з усей Расеи зрабиць адну вяликую магилу, а не упрауляць живыми людзьми. Кроу забитых братоу трудна забыць; слёзы их удоу и сорот не даюць спакою ни у дзень, ни у ночы.

Не, штыки и нагайки не успакояць народу! Для успакаення народу ёсць адна тольки рада: споуниць тое, чаго дамагаецца народ, даць уласць народным выборным, даць агульное, простое, роуное и тайное выборное право. Тольки тады настане спакой, тольки тады пачне народ жыць лепшаю, счаслиушаю долей!

Калиж правицельство не захочэ паслухаць воли народу, то далей будзе вайна, далей будзе лицца кроу...

А што з гэтаго выдзе?—цяперака ужо легко згадаць!

Присяга над крывавыми разорами.

Быу цёплы асенни дзень. Нивы циха адпачывали пасля летняе працы. Цёмны лес шэптауся у глыбокой задуми. Буслы тужлива ляцели на вырай.

Гэтаго дня моркотны и згорблены пад цяжкаю хмараю невясёлых дум ледзьве-ледзьве поуз стары Мацей у поле. „Галава балиць—рук ни зняць“, бурчау ён пацягиваючысь. „Дзяцей дагадавауся, а адпачыць некали и не заким“.—Так ён сам сабе жалиуся.

Прауда, у Мацея было трох сыноу: аднаго узяли у маскали, други паехау да Пецербурга шукаць хлеба, трэци пайшоу за парабка да двара, а бедны Мацей з жонкаю и двома малодшыми дзеучатками астауся у хаци на сваёй гаспадарцы.

Бедната, адзиноцтва, силы ужо ня тые—а раби и раби, працуй бяз конца... Мардасовичу за лён, Бизуноускаму за пашу, а там и за бульбу плужы и плужы што дзень на адработках, так што свае хоць и вузка, и лында, але и то нехват часу у пару засеяць. Ось и цяпер суседзи ужо дауно пасеяли и пабараснили, а Мацей тольки першы дзень выйшоу на свае и то быу хворы.

Аднак, перэмагаючы сябе, насыпау жыта у фартух, наплевау у жменю, чэрпануу зернят и з славами „Радзи, Божэ!“ сыпануу зерне на чорную глебу.

Зернята замигацели на рали. А Мацей стаяу з пасалавеушыми вачами и шэптау:

„Не магу — надтаж галава балиць и сон морыць“... И не укладаючыся ани пасцилаючыся ён як стаяу, так и лёг, так и заснуу...

Спау як пласт у паперок загону з раскинутыми руками. Лицо было бледна, губы чорны ад смаги, дыхау ён часта и з якимсь хрыпом. Здалёк выглядау на чалавека, катораго вот-вот разкрыжавали и прыбили да зямли, и так ён паволи канае...

Мацей спау и сниу. Сниу ён, што сабралася моц народу на яго ниви: были там ма-

ладые и старые, и мужчыны, и кабеты, и дзеци—у рожных апратках, и усе крычали: „...Узка! Цесна! Мала!..

А Мацею здавалося, што и ён сам стаиць пасерад гэтаго народу и што усе чэкаюць, што и ён сам, Мацей, скажець; и што вот-вот к яго сэрцу падходзиць неки жаль и што ён так само пачынае крычаць: „узка! цесна! мала!..“

Аж здаецца выбегае сусед Астап, зациснуушы кулаки, и крычыць ещэ мацней ад Мацея:

„А скуль узяць?! Скуль дастаць?! Кажы! Скуль?!“

Тады захистауся народ и зароу: „Глядзице! Во—прасторы! Во нивы, лесы, паля! Усё гэта ваша!...

А Астап; „Лжэце! Неправда! Не дадуць: то казеное, дворнае—ни я, ни вы не маем права! Не дадуць Пабьюць!“

— Вот далей здаецца Мацею, што з цьмы народу выходзяць яго тры сыны: парабок дворны, салдат и работник пецербургски, и становяцца на калены, и прысягаюць громка, ясна, паволи:

„Мы дамо! Мы сила—мы право!“

Мацей абливаецца потам, сэрцэ у яго бьецца... И здаецца яму, што усё гета спавиу туман: тольки разоры стаяць поуны крыви, а над ими висяць тры скрыжаваны далони... И раздаецца цихи ясны голас:

„Мы сила! Мы право!“

Мацей Крапиука.

Усяго па троху.

Як Крэсьцянски Банк прадае зямлю крэсьцянам.

Недауно правительство пастанавило, што, каб памоч малозэмельным крэсцянами дабыць болей зямли, треба зрабиць гэтак:

Кресьцянски банк будзе купляць зямлю ад памещыкоу, каторые захочуць прадаць свае маёнтки, и гэту зямлю будзе прадаваць крэсьцянам. Крэсьцянски банк ужо пачау спауняць наказ правительства. Праз 5 дзіон—ад 3 да 8 юля Крэсьцянски банк закупиу 60 маёнткоу на свой рахунок. Усяго зямли у гэтых маёнтках 63,463 (шэсьцдзесяць тры тысячы чатыриста шэсьцдзесяць тры) десяцины. За кожную дзесяцину банк плациць 126 рублёу, значыць за усю гэту землю заплачэно 8,029,150 рублёу.

Здаецца мужыком усё гэта добра—ёсць гдзе купиць зямли кольки трэба. Але па праудзи то не заусим так выходзиць. Кресьцяне, што купяць гэту зямлю, павинны за яе грошы разам з працэнтами выплациць праз 55 з палавиною гадоу, плацячы у год за кожную дзэзяцину 7 р. 78½ к.

За увесь гэты час крэсьцянам прыдзецца заплациць болей як 20 мильёноу рублёу за 63,463 дзесяцины зямли, што варта цяпер трохи болей як 8 мильёноу рублёу. От тутака уся бяда. Плациць кожны год крэсьцянскому банку па 7 р. 78½ капеек з дзесяцины апроч усих налогау и падаткау, што трэба будзе плациць казне,—гэта для бедных мужыкоу надта цяжка. И выходзиць так: плациць мужык адзин год, други, трэци, чацьвёрти, а пасля саусим згалее, не заплациць раз або два у назначэны час и за гэта банк адбярэ зямлю або прадасць другому. И гаспадар, што меу мала зямли, зноу будзе цярпець голад на сваёй надта ужо малой гаспадарцы.

Даходъ Расейскаго Цара.

Казна што год дае Цару 12,800,000 пэнсіи, значыць кожны месяц—выпадае болей як мильен, на дни, то усяки дзень Цар на сябе и свое семейство дастае 35,000 рубл.

Апроч таго цар маець шмат фабрык, лесоу и зямли 55,500,000 дзесяцин.

Кожное малолетнее царево дзиця бярэ 33,000 рубліоу пэнсіи, а як дойдзе да лет—мильён.

На утрыманне ж царавых сваякоу идзе доход з зямель удзельныхъ, каторых ёсць пакуль што 8,400,000 мильеноу дзесяци и каторые по прыкладу 1897 году дали 20 мильеноу рубл.

(Naujoje Gadyne).

Выдатки на стражникоу и палицію.

Цяпер во усих министэрствах выличаюць, скольки трэба будзе грошэй на усе гасударственные выдатки у 1907 годи. Министэрство унутрэных дзел ужо выличыло, што на стражникоу у 1907 году пойдзе з народных грошэй 400,000 руб. Агульны расход на палицію будзе больш як двадцаць чатыры мильоны руб.

(Нов. Вр.).

З Беларуси и Литвы.

НОВАГРУДОК (Менск. губ.).

У павеци Новагрудзком начала палиція прыцесняци сельских работнику, каторые баставали летом.

З гэтаго самаго павету правительство выслало восем вучыцелёу за агитацію памиж мужыкоу и за тое што яны раздавали чытаць забароненые писульки. Рэвидуючы некаторых вучыцелёу полиция знайшла выборски манифэст.

Усе вучыцели были жанаты и мусели пакинуць своих жонак и дзяцей без хлеба. Але тут мужыки заступилися за скрыуджэные сямейства и дали им зсыпку и памещэнне пакуль не вернуцца их высланые кармильцы.

— Усюды цяпер па віосках палиція арэштуе шмат людзей, найбольш крэсцян. Арэштуюсь больш усяго за забастоуки. З Новагрудзкаго павету пишуць, што там апроч забастоущыкоу нескольки крэсцян арэштавали за тое, што яны раздавали манифэст Думы, написаны у Выборгу пасля разгону Думы. (Сѣв.-Зап. Гол.).

Пагарэльцы, Новагрудзкаго павету. Грамадзки сход пастанавиу харчэваць на свой копт сямьи арыштованых крэсцян и не даваць квартеры казакам.

З Лиды.

На Зельву у Василиской волосци зладзеи пакрали кони. Гаспадары хутко згледзилися и пагналися следом за конокрадами. Зладзеи у Лиду—и гаспадары у Лиду, ды да палиціи з прозьбою, каб перэтрасци мястэчка. Аж спраунік сам выйшау да збядаваных госпадароу и сказау: „Не магу, братцы, я вам даць стражникоу, мне ихъ дау губэрнатор, каб сматрець за спокойствіем.» Вышла тое, што гаспадары самы прыгнали злодзёу над скрыдэлка палиціи. А трэба ведаць, што па тую пару было вучэнне стражникоу и их зъехалося яких з семдзесят чалавек, так што ня тольки мястэчка, а цэлы павет маглиб ператрасци.

ЖЫРМУНЫ Лидзкаго павету:

У восени у прошлым гаду крэсцяне Жырмунской валасци пастанавили устроиць па вёсках свае школы, у каторых учыли бы дзяцей и па польску. Начальство не дазволило им зрабиць гэта. Дзеля таго усе крэсцяне згаварылися не пущаць сваих дзяцей у казёную школу и не даваць грошы на гэту школу.

У вучылищы ёсць вучыцель народны—неяки Данько, чэлавек нягодны. Заусягды йон ваевау з крэсцянами, рабиу им усё злое, што мог. Часта крэсцяне падавали жалобы на яго вучылищнаму начальству, але з гэтаго ниякого толку ня было. Данько застауся на сваим мейсцу.

За тое цяпер, як крэсцяне пастанавили не насылаць дзяцей у школу, вучыцель Данько написау данос начальству на самых бойчэйших крэсцян и назвау их бунтоущыками. И цяпер палиция глядзиць на гэтых крэсцян як на праудзивых бунтоущыкоу.

Писали крэсцяне аб новых школах глауному министру Виттэ, але и тут ничого не дабилися. Скончылася уся справа тым, што вучыцель падау на крэсцян жилобу у суд. Цяпер суд прысудзиу прадаць дабро крэсцян, каб таким способом узяць ад их грошы на вучылищэ, з катораго нихто не карыстае. Цешыцца Данько, што таки прыцисну́й крэсцян, и чэкае, як гэта праз нескольки дзён споунищца прыгавор суда, як будуць забираць мужыцкое дабро... З яго пайшла у нас гэта беда, нехай жэ на яго упадзе и кара за яе.

Дзякаваць Богу, што таких нягодныхъ вучыцелёу мало ёсць у нашым краю.

З над Вильи. Сельскіе забастоуки были гэтым летом мало не усюды па берэгох Вильи у Виленской губэрни. Цяпер трохи прыцихли, але здаецца не надоуго. Чекаюць тутака вяликой забастоуки, як падыдзе капанне бульбы. Гэтай забастоукою крэсцяне хочуць дабицца таго, каб пагнила уся бульба, катора мае исци да бравароу на гарелку, каб таким парадком прымусиць пазакрываць усе бровары и не даць казне зарабиць на прадажы гарэлки.

Kur. Lit.

— У мястэчку Парафьяново 9 липеня (юля) сабрауся валастныы сход, каб выбраць дэпутата у паветовую зямельную камисію. Згаварыушыся памиж сабою на сходзи, кресцяне пастанавили **дэпутата не выбираць** и написали прыгавор, што не выбираюць яны сваго дэпутата дзеля таго, што земельные камисіи—гета штучка правительства, каторому яны не верaць и каторае давяло усих людзей да беднасьци и што тольки ад Думы спадзеваюцца яны палепшення сваей доли.

— Як пишэ газэта «Северо-Западны Голос», памешыкам Виленской губэрни Вилейскаго павету панам Тукалло и Любанскому губэрнатор дазволіу купиць винтоуки и да их патроны для стражникоу, каторые назначэны пилнаваць маёнтки гэтых паноу.

З надъ нёману.

Разгон Думы задзивиу ганебне вёсковыхъ беларусоу и прыняволиу их крэпка, крэпка задумацца над тым што цяпер ёсць и што будзе...

Беларусы, прыбитые да вузенькаго кавалочка зямли, найбольш цикавяцца разшырэннем яго; вотож и думали яны што найважнейшым дзелам депутатау будзе вайна за землю. Дзеля таго, як правительства разагнала Думу, кожны з мужыкоу сказау: „гэта за землю!“ И злосць закипела у сэрцы кожнаго и стали мужыки разпытываць; „Гдзе дэпутаты, што цяпер робяць“. А тут подайшоу и выборски манифэст, каб падаткау не плациць и рэкрутоу не даваць. Людзи пачали пытаць и талкаваць на рожные лады. Трэба прызнаць прауду што прызыу дэпутатау мае вялики послух серэд народу, и ня ведама ещэ чым скончыццца, як падыдзе набор и збиранне падаткау.

Трэба ведаць, што сама езда дэпутатоу да Выборгу разъяснила цёмным мужыком, што значыць констытуця. Бо простые людзи думали, што Выборг ёсць заграничны горад и што дэпутаты паехали таму у чужую зямлю, каб их не магло правительства арыштаваць. Пасля даведалися,

што не, што Выборг так сама ёсць горад расейскаго гасударства. И вот тады кожны палажыу палец на губах и сказау: „А штож гэта такое?“

Але тут знайшлися и такие, каторые разталкавали, што Выборг ёсць горад у Финляндiи, а Финляндiя хаця и належыць да Расеи, але маець сваю конституцю, а як ёсць конституця, то ня можна чэлавека без пастанауления суду арыштаваць и пасадзиць у турму, як гэта у нас робицца без усялякой патрэбы дый прычыны. „Ага!—сказали мужыки,—вотъ гэта добра!“

На новые-ж выбары людзи вёсковые глядзяць дваяка: адны кажуць, што ня трэба выбираць дэпутатау, бо и зноу разгоняць. А другие зноу цягнуць за выбары и кажуць: „будзем выбираць, але ужо выбярэм таких людзей, каторых не зможе разагнаць правицельства!“ *(Понедельник).*

З Бельскаго павету Грод. губ.

Да «Нашэй Доли» пишуць: 24 iюля (лишеня) крэсцяне усей Кленикской волосци на валастным сходзи прыгавором № 8 пастанавили не споуняць стойковую павинносць пры становой квартэры. Тое самое ещэ раней пастанавили на валастных сходах крэсцяне Лосинской и Паулоуской воласцей.

Гомель. Да Люцына прыехау агитатор. Сабраулся у мястэчку вялики митинг (сход), каб паслухаць таго агитатора. Пачуушы гэта зъявилася на сход палиция, каб арыштаваць агитатора. Але сабраушыся народ не дау яго палиции, а сам яе арэштавау и не пущау з рук своих, пакуль агитатор ня скончыу гаварыць и не паехау. (Kur, Lit.).

З Быхова тэлеграфуюць: пяць волосцей выбрали дэпутатоу да зямельной камисiи, а пяць других пастанавили дэпутатоу не выбираць и не насылаць.

(Сев -Зап. Голос).

З **Татарска** (Могилёуской губ.):

Недауно сельская палиция арыштавала нескольки крэсцян. Як народ пачуу гэта, пачали биць у цэрконые дзвоны на трывогу; сбежалося кале тысячы крэсцян, арыштованых асвабадзили, а палицию моцна набили. Кажуць што стражники ад страху перад народом начали тут кидаць службу. Прыслана сюды войско.

(Volkszeit).

— У новоалександроуским павеци з намеж 32 волосцей выбирали дэпутатоу да земельных комиссiей тольки 9 волосцей, 23 волосци заявили, што тольки Госуд. Дума можэ пастанавиць, як надзелиць крэсцян землёю.

Але и з дэпутатоу тых 9 волосцей, каторые их выбирали, малая была карысць. Сабралися яны да паветоваго гораду и, згаварыушыся тут, пастанавили кинуць паветовые выборы и разъехалися да хат. (Эхо).

Па Расеи.

З палудня Расеи. Газэци «Frankfurter Zeitung» целеграфуюць з Расеи: у палудзеной часци Расеи усе крэсцяне пастанауляюць не плациць падаткоу; чакаюць вяликаго бунту у гэтай агромнайчасци Расеи.

(Око).

— **У Кацельни,** Житомирскаго павету мужыки не хацели каб разом з ними были стражники у цэркви. Усих выгнали вон, а аднаго дык надто крэпка збили парахвiяне. На стражникоу напау страх: адзин кинуу службу, а другiе так сама мусиць адрэкуцца ад начальникавання.

У мястэчку Рэшацилоуцы палтауской губ. стражник зарубiу на смерць мужыка. Усе мястэчковые людзи патрэбовали, каб им выдали винаватаго и каб вон вывели з мястэчка усю палицю. Прыстау выслау палицю, и тады усе успакоилися.

— Самарски губэрнатор данёс министру унутрэных дзел, што надта шмат стражникоу пакинуло службу. Стражники ня хочуць цяпер служыць дзеля таго, што прыходзицца им исьци процпу тых самых мужыкоу, з каторых и яны выйшли и каторые ваюють за агульное мужыцкое счасьце и долю. Але ёсць ещэ и другая прычына, котора наганяе марозъ на стражникову шкуру: гэта прыгаворы сельских обчэств, кабъ стражники не дастали николи падушныхъ надзелоу зямли.

(Око).

Сымбирск. На мелекеской жалезной дарози нехто спалiй тры масты. Кажуць, што зрабили гэта крэсцьяне, каторым дарога ужо восем гадоу ня плоциць грошэй за крэсцянскую зямлю, забрануу на гэту дарогу.

НА КАУКАЗИ.

Рэволюцыйны процправицельственны розрух не сцихае. З гораду Кутаису 15 августа пишуць, што там арэштавали на вулицы свящэника каторы раздавау процивоправицельственные паперки. У гэтым самым горадзи у казiоной друкарни выдруковали сицилисты 36 тысячоу паперкоу.

— Начальник штабу тыфлискаго ваеннаго округа дастау тэлеграму ад камандзира другога Горско-Мухабскага полку, што 4 и 5 сотня яго полку, каторые были посланы у село Петроуское, адказалися стрэляць у народ, каторы хацеу асвабадзиць арыштованных агитатороу. (Око).

З Кирылоускаго уезду ноугородзкай губ. пишуць «Пецерб. Листку»: „У насъ збираць падатки пачали военаю силай.

У сяло Ухтому зъявилася 16 стражникоу, узвод салдатоу, урадники—усе над камандаю испраунника. Начальства заехала да хаты старасты, тут сабралися и крэсцьяне, каторых начальство пачало намауляць, каб плацили падатки. Але гэта ничого не намагло—крэсцьяне заявили, што плациць ничого ня будуць.

(Своб. Слово).

У Владзимирской губэрни крэсцяне ва многих месцох пастанауляюць ня пиць казёной гарэлки. У некаторых месцох разбиваюць манапольки.

(Своб. Слово).

Авечы агитатор

Скрыпяць шубеницы, на астрогах духота, у Сыбиры нема месца!—И не дзивота!.. Бо кали пригледзишся да усихъ „унутрэных ворогоу“ правицельства, то ня тольки горка слеза запячецца на вачах, але часта и колька стане у боку ад чыстаго смеху.

Прымерам таки вораг: у Калужской губерни у Жыздрынском павеци недалека вёски пасьвилася быдла. Настау вечэр—пара ужо гнаць скацину да хаты. Пастух, замахнуушися пугаю, закрычау: „Ну, скацинка, падымайся, ад старых парадкоу адрэкайся!“—и заграу на дудцы „марсыльянку“.

Як раз у той час мимо ехау з казаками прыетау Лавров и Стой!“—закрычау строги прыстау на сваю дружыну. „Арыштоваць агитатора!“.

Кинулися тут да пастуха казаки, уханили яго, беднаго, и пацягнули у астрог.

Вотъ вам и „унутрэны ворагъ“, вотъ агитатор серад бараних и валовых печеняу! Убояуся мусиць пристау, каб не пашоу рэволюцыйны розрух памеж авечак и целятъ вёсковых!

Бедны пастушок—скруцяць цябе у барани рог ды пашлюць куды у Сыбир. А не бярыся бунтаваць авечак: кали свине спяць, нехай спяць и авечки!..

Наш родны край.

Край наш бедны, край наш родны!
Грась, балота ды пясок.
Туць дзѣ троху луг пригодны...
Хвойник, мох ды верасок.
А туманы, як пяленка,
Засцилаюць лес и гай...
Ой ты, бедная старонка!
Ой, забыты Багам край!
Наше поле кепска родзиць;
Бѣдна тут жыве народ.
У грази ен, бедны, ходзиць;
А працуе—льецца пот
Пазираюць нудна вески.
Глянешь—сэрца забалиць.
На дворэ—паленья, щески;
Куча сметнику ляжиць.
Крыж хваевы пры дарози;
Кучка тополеу сухих...
Сцишина, нудна, як у вастрози,
Як на могилках яких.
А як песня панясецца,—
Кольки у песни той нуды!
Уцякау бы, бег, здаецца,
Сам ня ведаешь куды.
Край наш родны Бедна поля!
Ты глядзишь, як сирота.
Нудна ты, як наша доля,
Як ты, наша цемнята!

Якуб Колас.

Ад Редакціи.

Просим вельмиважаемых чытацелёу выбачиць нам, што перши нумэр «Нашей Доли» ня здолели выдаць так, як таго хацели. Найбольш прыкра нам, што нима у ём ничаго з зямельной гаспадарки. У других нумэрах гэтаго браку ужо ня будзе. Просим писаць да нас, писаць аба усём што дзеецца, аб крыудах сваих и радосьцях, хто як умее. Кали патребна будзе каму якая парада—пытайцеся—атказэмо. Ведайце добра што «Наша Доля» газэта вясковых людзоу.

Прысылаючи грошы просим писаць якое выданное «Нашое Доли» присылаць: ци друкованое рускими литэрами ци польскими.

Хто хочэ палучаць газэту просим паспяшыць з прысылкою грошу. Нумэр други «Нашое Доли» з прычын од рэдакціи незалежных выйдзець 14 сенцябра.

Рэдактор-выдауца **Иван Тукеркес.**

ОБЪЯУЛЕННЯ:

Типографія «**Артель Печатнаго Дѣла**», Вильна, уг. Большой и Рудницкой ул., д. Залкинда